ансамбля вводят три баяна с целью замены духовых инструментов, таких как флейта, кларнет, гобой. Несмотря на разнообразность составов ансамблей на современном этапе, тем не менее следует строго соблюдать фольклорные традиции и школу народного инструментализма.

Активная деятельность в области народно-инструментального фольклора ведется заслуженным артистом республики В.А.Куприяненко. Им осуществлена значительная работа по формированию репертуара, состоящего из отдельных программ, созданных на базе традиционного и современного фольклора, которые без каких-либо изменений, в первозданном виде, переносятся на профессиональную сцену. Именно в этом и состоит главная заслуга руководителя ансамбля народной музыки "Свята" В.А.Куприяненко.

Рассмотренные нами отдельные тенденции развития традиционного инструментального творчества в новой для него направленности активно воздействуют на формирование и деятельность профессиональных ансамблей народных инструментов Республики Беларусь.

**І.Л. Коган,**
*заг. навукова-даследчага*
*аддзела БДУ культуры*

## АБ ПАНЯЦЦІ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА БАЛАНСУ

Да гэтага часу ў айчыннай і замежнай навуцы аб чалавеку, грамадстве або культуры адсутнічае больш ці менш ясны і дакладны крытэрый ацэнкі стану або патэнцыяльных магчымасцей таго ці іншага сацыякультурнага свету. Кожная з самастойных навуковых дысцыплін, напрыклад сацыялогія або дэмаграфія, мае пэўныя сродкі арыфметычнага аналізу стану свайго прадмета даследавання, хаця, безумоўна, гэтыя метады дакладнага аналізу складаюць толькі невялікую долю ад усяго комплексу навуковых даследаванняў, якія ўваходзяць у арсенал тых ці іншых навук. Акрамя таго, ніхто да гэтага часу не выявіў фундаментальных суадносін паміж дакладнымі і філасофскімі метадамі аналізу, як няма і не можа быць крытэрыю, згодна з якім можна было б сцвярджаць, што і чаму павінна папярэднічаць: практыка тэорыі або тэорыя практыцы. Што тычыцца прадмета культуралогіі і яго ацэнкі, дык тут думка проста пападае ў тупік, калі робіцца спроба



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошуку больш ці менш яснага, дакладнага метаду даследавання.

Не ўступаючы ў дыскусію аб змесце прадмета культуралогіі, якая можа нас завесці ў непраходныя джунглі сумненняў, мы будзем разумець пад паняццем асноўнага культуралагічнага прадмета сацыякультурны свет, г. зн. адзінства чалавека, грамадства і ўласна культуры. Такое пашыранае разуменне культуралагічнага прадмета ў адрозненне ад большасці думак на гэты конт, якія абмяжоўваюць яго толькі сферай культуры (часам нават не абцяжарваючы сябе клопатам расшыфраваць гэты "праклятьі" тэрмін), на наш погляд, не толькі дазволена або пажадана, але і неабходна. Па гэтым пытанні мы схільныя прытрымлівацца думкі тых, хто разумее пад паняццем культуры не абстрактна-сімвалічную рэальнасць (архетыпы, універсаліі, узоры і да т. п.), але ўвесь культурны свет, уключаючы свайго творцу, носьбіта і спажыўца — чалавека і чалавечае грамадства. Тыя, хто схільныя раз'ядноўваць культуру і грамадства, знаходзяцца пад уплывам такіх мысліцеляў, як Шпенглер, які ўвёў у культуралогію апазіцыю "культура — цывілізацыя". Але калі час станаўлення культуралогіі апраўдваў падобныя схемы і тэорыі неабходнасцю адрознівання ўсеагульнага космасу навук аб чалавеку і ўласна разумення яго сферы жыцця, то сёння такі погляд на культуру ўстарэў. Мы павінны не толькі мець на ўвазе ўсю складанасць і шматграннасць чалавечай актыўнасці і ўкладу чалавечага жыцця, але пры гэтым не павінны выпусціць з-пад увагі тое цэлае, дзеля якога чалавечая думка наогул прыйшла да падобных бяскрайніх берагоў, як у паняцці "культура".

Культура без чалавека — толькі метадалагічны прынцып, падыход да вылучэння аб'екта з неабсяжнага акіяна іншых аб'ектаў. Але пры гэтым не трэба забываць, што ў паняцці культуры мы маем не проста аб'ект нароўні, скажам, з аб'ектам геаграфіі, фізікі або анатоміі. У паняцці культуры мы маем тое цэлае і ўсеагульнае, якое да гэтай пары навука спрабавала раскрыць у такіх галінах ведаў, як этнаграфія, сацыялогія або антрапалогія. Кожная з гэтых навуковых дысцыплін спрабавала асэнсаваць жыццё чалавека, зрабіць яго сваім асноўным прадметам даследаванняў з таго ці іншага пункту гледжання. Але кожны раз даводзілася спыняцца тады, калі метадалогія дадзенай навуковай дысцыпліны не магла змясціць у сабе нарастаючы космас чалавека. Ці можна разглядаць чалавека як істоту, што ўступае ў бесперапынныя сацыяльныя сувязі з іншымі людзьмі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

незалежна ад гістарычных, культурных, рэлігійна-этычных умоў, у якіх ён нарадзіўся і вырас? Ці павінна антрапалогія (асабліва ў яе заходнім разуменні) абмяжоўвацца вывучэннем анатоміі чалавека, пачынаючы ад яго старажытнейшых продкаў, і пры гэтым не звяртаць увагу на сацыяльную структуру і культурныя каштоўнасці грамадства, дзе ён жыве? Ці мае права этнаграфія ўхіляцца ад пытанняў аб магчымасці тыпалагізацыі этнасаў і іх культур, ад пошукаў агульных для іх усіх структур псіхікі і культурных традыцый? Хто ж з вучоных у такім выпадку будзе займацца пошукам заканамернасцей у міжкультурнай камунікацыі, у раскрыцці механізмаў сімпатыі і варожасці паміж дзяржавамі і іх культурамі, схаваных сэнсаў і значэнняў тых знакаў і знакавых сістэм, якія выяўляюць унутраную будову пэўнай культуры ў цэлым, ва ўсім комплексе яе разнастайных элементаў, структур і іх сувязей, яўных і няяўных?

Культуралогія, такім чынам, у шырокім разуменні яе прадмета ёсць навука аб сацыякультурным свеце, дзе не толькі працэс і вынік складаюць адно цэлае, але і сам чалавек уключаны ў гэту сістэму як цэнтральнае звяно. Таму па аналогіі з любой сістэмай у культуры як у сацыякультурным свеце важнейшую ролю правільнага, эфектыўнага існавання і функцыянавання складае яе баланс. Што азначае баланс сістэмы ў адносінах да сацыякультурнага свету?

Само азначэнне "сацыякультурны свет" заключае ў сабе як мінімум два элементы — грамадства і культурныя феномены. Але калі паняцце грамадства больш або менш зразумелае, дык паняцце "культурныя феномены" трэба растлумачыць. З часу з'яўлення "Фенаменалогіі" Гусерля (і нават раней, з часу "Фенаменалогіі духа" Гегеля) пад феноменам звычайна разумеецца пэўная склаўшаяся форма, якая валодае ўстойлівымі індывідуальнымі ўласцівасцямі. Да феноменаў, відавочна, можна аднесці не толькі вобразы і паняцці чалавечай псіхікі, але і іх сістэмы, вяршыняй якіх, верагодна, могуць служыць архетыпы цэлай культуры. Адначасова да феноменаў могуць быць аднесены таксама і спосабы вытворчасці і вытворчай дзейнасці (нароўні з яе вынікамі). Аднак, з нашага пункту гледжання, тут прапускаецца важны момант, калі разглядаецца дзейнасць таго або іншага феномена: звычайна дзеянне ці паводзіны аналізуюцца як праява пэўнага феномена, хаця само дзеянне, учынак уяўляюць сабой такі ж феномен культуры, як і форма, у якой яны здзейснены. Інакш кажучы, часцей за ўсё не ўлічваецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактар чалавека, які з'яўляецца не толькі творцай культуры, але і яе спажыўцом. Чалавек жа — гэта не проста феномен псіхікі, які дзейнічае або бяздзейнічае, і нават не набор падобных феноменаў; чалавек — гэта штосьці значна больш складанае, у сваёй сутнасці ён стаіць як бы над феноменамі культуры; ён перавышае іх як сваіх маштабах, так і здольнасцю кіраваць імі.

Напрыклад, такі феномен псіхікі, як ідэя справядлівасці, безумоўна, ёсць у кожным чалавеку, але яна напоўнена па-рознаму афарбаваным зместам. Чалавек можа дзейнічаць у адпаведнасці з ідэяй справядлівасці або насуперак ёй, усведамляючы яе ці не, ацэньваючы як вышыню і ўсеагульнасць ці спадзеючыся на яе сацыяльнае распаўсюджанне. Але ва ўчынках чалавека, здзейсненых нават у адпаведнасці з ідэяй справядлівасці, будуць утрымлівацца ўвесь яго папярэдні вопыт, усе яго сацыяльныя і іншыя кантакты, яго выхаванне і адукацыя, яго рашучасць або страх. Мы ведаем шмат цудоўных людзей, якія разважаюць на тэму аб справядлівасці, але не здольныя па розных псіхалагічных прычынах дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі перакананнямі. У гэтым сэнсе чалавек і разумеецца намі не толькі як набор або сістэма псіхічных феноменаў, а культура — не толькі як сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Культура, часткай якой з'яўляецца чалавек, ёсць перш за ўсё энергетычная сістэма, і разгляд яе з гэтых пазіцый, магчыма, прывядзе ў будучым да стварэння блізкай да дакладных навук метадалогіі даследаванняў як феноменаў культуры, так і культуры ў цэлым. Ужо К.Марксу была блізкая ідэя пошуку грамадства і прадбачання гэтага стану ў будучым, калі ён узяў за меру даследаванняў чалавечую працу. Не аспрэчваючы гэтае палажэнне з прычыны відавочнасці яго тэарэтычнай слабасці, трэба аддаць належнае заснавальніку гістарычнага матэрыялізму ў смеласці і глыбіні мыслення. Безумоўна, чалавечая праца, разглядаемая як адна з многіх формаў чалавечай актыўнасці, можа ацэньвацца і энергетычна. Сам факт таго, што праца ва ўсім свеце аплачваецца і існуюць ясныя крытэрыі каштоўнасці пагадзіннай працы, сведчыць аб усведамленні чалавекам цэннасці чалавечай дзейнасці. Прычым аплачваецца не толькі фізічная, але і разумовая праца, а такі падзел працы і грамадскіх багаццяў магчымы толькі ва ўмовах з'яднанага грамадства і моцнай дзяржавы. Апошнія ж цалкам залежаць ад ступені і формы чалавечай актыўнасці, ад сукупнай сумеснай дзейнасці тых людзей, якія з'яднаны пад сцягам той ці іншай дзяржавы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тое, што кожны чалавек ёсць грамадзянін, г. зн. складае каштоўнасць, рэзерв і моц дзяржавы, даўно з'яўляецца ісцінай. Але калі чалавек ёсць біялагічная сістэма, якая можа быць ацэнена і выражана з энергетычнага пункту гледжання, тады і грамадства, і дзяржава павінны мець падобныя крытэрыі энергетычнай ацэнкі як цэлага, хаця тут, магчыма, уступаюць у сілу нейкія яшчэ невядомыя навуцы канстанты. Мы не будзем зараз падрабязна аналізаваць гэты падыход да даследавання грамадства, але заўважым, што гэтыя канстанты маюць прамыя адносіны да тых абстрактна-сімвалічных асноў грамадства і культуры, якія і ствараюць з многіх людзей грамадства, а з сукупнасці дзеянняў — культуру.

На чым грунтуецца згуртаванасць грамадства? Перш за ўсё на пражыванні на адзінай тэрыторыі і на вядзенні агульнай гаспадаркі. Але толькі да гэтага нельга звесці тую моцную сувязь, якая існуе ў межах той ці іншай дзяржавы. Тут дзейнічаюць больш глыбокія сувязі, тут павінна прысутнічаць больш трывалая аснова згуртаванасці, якая адносіцца да этнакультурнай сферы. Без наяўнасці пэўных агульных для ўсіх людзей дадзенай сацыяльнай групы сімвалаў, напрыклад сімвала агульнага продка, заснаваўшага род, племя, народ, агульнай для дадзенай групы гісторыі, няма і не можа быць фундаменту для падобнага адзінства людзей. Акрамя таго, выпрацаваныя на працягу доўгага часу стэрэатыпы мыслення, паводзін, светаадчування, спосабы апрацоўкі зямлі, палявання або адносін з суседзямі, г. зн. усяго таго, што мы называем культурнай традыцыяй, ствараюць моцны маналіт чалавечага згуртавання. Толькі на падставе агульнай культурнай традыцыі грамадства здольна адэкватна і эфектыўна адказваць на выклікі часу і прыроды, г. зн. выжываць і развівацца.

Але культурнай традыцыі таксама недастаткова для таго, каб грамадства сапраўды развівалася. Для гэтага яму неабходныя яшчэ ўзоры, мадэль таго ідэальнага стану, да якога яно хацела б рушыць. Ідэалы, такім чынам, складаюць другі элемент структуры згуртаванага грамадства, утвараемай жорсткім структурным хрыбтом "традыцыя — ідэал". Толькі ў межах падобнай структуры грамадства здольнае не толькі выжыць, але і ствараць новыя мадэлі мыслення і паводзін, распаўсюджваючы іх сярод свайго насельніцтва. І калі паспрабаваць прымяніць метадалогію энергетычнага аналізу грамадства і культуры, то схематычна мы атрымаем наступную карціну.

Любая дзейнасць патрабуе энергетычных затрат. Гэтае палажэнне не патрабуе доказу. Але адначасова нельга забывацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і пра тое, што простае існаванне таксама патрабуе энергетычнага забеспячэння. Элементарнае функцыянаванне сацыякультурнага свету як сістэмы звязана з захаваннем у любую мінуту яго існавання згуртаванасці ўсіх яго членаў. Прычым кожны з іх павінен унутрана адчуваць сябе часткай дадзенага этнасацыякультурнага свету, што магчыма дзякуючы дзеянню культурнай традыцыі. Такім чынам, культурная традыцыя, з энергетычнага пункту гледжання, — гэта энергетычная крыніца, якая забяспечвае этнасацыякультурнае *адзінства* ўсіх уваходзячых у яго людзей. Але гэтай крыніцы зусім недастаткова для сацыякультурнага *развіцця*. Для гэтага неабходна іншая, больш магутная і, галоўнае, адэкватная крыніца сілкавання. Такім энергетычным рэзервуарам, які забяспечвае ўласна развіццё, мадэрнізацыю і інавацыю ў грамадстве, служыць сфера ідэалаў дадзенай культуры. Немагчыма развівацца без канкрэтных мадэлей ідэальнага стану чалавека і грамадства, якія б былі блізкія ўсім людзям або большасці дадзенага соцыуму. Але гэтыя мадэлі нельга разглядаць толькі ў якасці структур, формаў культурных дасягненняў або спосабаў культурнага развіцця. Гэтыя ідэальныя мадэлі самі па сабе ёсць энергетычныя крыніцы, што забяспечваюць культурнае развіццё грамадства. Механізмы ўтварэння культурных ідэалаў, іх энергетычнага напаўнення і перадачы энергіі грамадству для яго развіцця мы не можам разгледзець у гэтым артыкуле па прычыне яго невялікага аб'ёму. Паспрабуем гэта зрабіць у наступных нашых артыкулах. А тут лічым неабходным сказаць некалькі слоў аб паняцці так званага сацыякультурнага балансу.

*Сацыякультурны баланс — гэта перш за ўсё энергетычны баланс паміж існаваннем і развіццём грамадства.* Гэта новы тэрмін, уведзены аўтарам дадзенага артыкула ў адной са сваіх прац, а таму чакаць поўнага раскрыцця зместу гэтага паняцця не варта, асабліва ў рамках артыкула. Тым не менш, апісаная намі схема ўяўляе сабою частку сацыякультурнага балансу, у які павінны быць уключаны практычна ўсе значымыя феномены культуры і сацыяльныя інстытуты. Але агульная структура любога грамадства, апісаная намі як "традыцыя — ідэал", ужо прадугледжвае ўнутраны баланс паміж сілай культурнай традыцыі ў грамадстве і ўладай сацыякультурных ідэалаў, іх вышынёй і маштабам. Зразумела. што калі ў грамадстве будуць пераважаць традыцыі, пакланенні мінуламу (героям, правадырам, багам як прабацькам нацыі і да т. п.), то такое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства будзе кансерватыўным і няздольным на адэкватную неабходнасць мадэрнізацыі, а тым болей культурныя дасягненні (у навуцы, мастацтве, тэхніцы або рэлігіі). Захопленасць навацыямі, прага пастаянных перамен, адсутнасць належнага шанавання сваіх продкаў таксама парушаюць неабходны баланс паміж традыцыяй і ідэалам, г. зн. паміж размеркаваннем усёй культурнай энергіі, якой валодае дадзенае грамадства. Таму баланс паміж традыцыяй і ідэалам, паміж мінулым і будучым у культуры — гэта перш за ўсё баланс усяго сацыякультурнага свету, здольнага не толькі на захаванне згуртаванасці і выжыванне ва ўмовах ціску знешняга асяроддзя, але і на культурнае развіццё, г. зн. на магчымасць сукупнага грамадскага дзеяння, якое заўсёды становіцца гістарычным. Такім чынам, паняцце сацыякультурнага балансу набывае важнейшае значэнне не толькі як адно з галоўных паняццяў у даследаванні культуры, але і ў якасці магчымай асновы новага метадалагічнага аналізу культуры, успрымаемай як адзінства чалавека, грамадства, працэсаў і вынікаў іх дзейнасці.

**І.М. Шумская,**
*аспірантка*

## ПРАБЛЕМА ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВА ЎМОВАХ ДАМІНАВАННЯ МАСАВАЙ КУЛЬТУРЫ

Новая грамадска-палітычная сітуацыя, якая склалася ў былых саюзных рэспубліках напрыканцы 80-х гадоў, развіццё дэмакратыі і галоснасці, пераход на рынaчныя адносіны дазволілі пераадолець шматлікія ідэалагічныя і дагматычныя традыцыі як у функцыяніраванні культуры і мастацтва увогуле, так і ў эстэтычным выхаванні чалавека ў прыватнасці. Аднак новыя сацыяльныя ўмовы стварылі сур'ёзныя маральныя, псіхалагічныя і эстэтычныя праблемы ў мастацкай культуры. Усе яны патрабуюць навуковага асэнсавання.

Вядомы іспанскі філосаф Хасэ Артэга-і-Гасет у адной са сваіх прац адзначаў, што ў сучасны перыяд у чалавечым жыцці дамінуюць тры “М”: масавае грамадства, сродкі мас-медыя і масавая культура (7). Бясспрэчна, гэтыя “тры кіты” вылучаюцца і на агульным фоне сацыякультурнай парадыгмы, якая мае месца ў дадзены момант у Беларусі.